гадзіны ночы, у той час, калі чалавек сніць першы сон. Час дзейнасці П. зближае іх з *Начніцамі*.

*Літ.*: Никифоровский Н.Я. Нечистики: Свод простонар. в Витебской Белоруссии сказаний о нечистой силе. Витебск, 1995. С. 44—45.

*У. А. Васілевіч.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**ПАЎНО́ЧНІКІ**, ліхія духі невядомага выгляду і дакладнага месца жыхарства (селяцца па ўсіх сядзібных забудовах, дзе жыве чалавек). Па іх галасах і хуткіх рухах можна здагадацца, што гэта — маладыя гарэзы абодвух палоў, якія вандруюць і гуртам, і паасобку. З інш. сядзібнымі нячысцікамі яны не ладзяць. П. пачынаюць сваволіць у час начнога спакою, абуджаюць цішыню дзікімі чалавечымі воклічамі, фальшывымі просьбамі пра дапамогу, плачам ці дзікім рогатам, свістам і ровам буры. Усё гэта адбываецца звонку памяшкання з 11 гадзін вечара і да 3-й